Х ЗЬЕЗД ЛКСМБ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 5 (1274) ЧАЦЬВЕР, 8-га студзеня 1931 г.



У прэзыдыуме зьезду

Будзем ударнікамі трэцяга, рашаючага

Штодзённымі клопатамі аб чырвонафлётцах забясьпечым баявую магутнасьць чырвонага флёту

Прывітальная прамова тав. Волкава на Х зьезьдзе ЛКСМБ

Ад імя асабістага складу лінкора „Парыская Комуна" старэйшаму шэфу лінкора—Х зьезду комсамолу Беларусі—баявое чырвонафлёцкае прывітаньне (аплёдысмэнты).

Таварышы! Х зьезд КСМ Беларусі сабраўся ў той момант, калі, на аснове соцыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, мы маем наяўнае ўзмоцненае супраціўленьне клясавага ворага, абвастраньне клясавай барацьбы ў краіне. Гэта патрабуе ад КСМ організацыі больш клясавай пільнасьці, яшчэ большага ўзмацненьня барацьбы за генэральную лінію партыі.

Комсамольская організацыя мае шэраг буйных дасягненьняў у галіне павароту тварам да пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва, мае вялікія дасягненьні ў рабоце на вёсцы, у справе будаўніцтва колгасаў. Але КСМ ня можа пахваліцца вялікімі дасягненьнямі ў галіне ваенізацыі.

Х зьезд ЛКСМБ павінен удзяліць вялікую ўвагу пытаньням ваенізацыі. Комплектаваньне нашай арміі прымушае комсамольскія організацыі заняцца пытаньнем падрыхтоўкі кадраў у армію і флёт.

Клясавы вораг імкнецца папасьці ў шэрагі арміі, каб разлажыць яе, ён імкнецца ўнесьці разлажэньне і ў шэрагі Чырвонага флёту. Комсамольская організацыя Беларусі—шэф нашага лінкора—павінна больш шчыльна зьвязацца ў сваей практычнай рабоце з КСМ організацыяй карабля і дапамагчы вялікай рабоце чырвонафлётцаў.

Трэба сказаць, што КСМ Беларусі зрабіў шмат для лінкора „Парыская Комуна", але разам з тым мы павінны адзначыць, што ў апошні час маецца паслабленьне работы па шэфству.

Лінкор „Парыская Комуна" знаходзіцца на Чорным моры і праводзіць работу па прыстасаваньню да новых умоў, на другім моры. КСМ павінен дапамагчы нам у гэтым. Адсюль, на Х зьезьдзе КСМ Беларусі павінна быць пастаўлена задача, больш увагі пытаньням палітычнага забясьпечаньня праводзімай работы.

Толькі органічная сувязь КСМ Беларусі з асабістым складам лінкора „Парыская Комуна" дасьць нам гарантыю ў тым, што нашы задачы будуць з посьпехам выкананы.

Мы ведаем, як сачыла буржуазія за паходам лінкора Кроншгадт—Севастопаль. Яна сочыць і цяпер, яна правярае магутнасьць і баяздольнасьць чырвонага флёту.

На гэтым зьезьдзе мы павінны паставіць пытаньне аб яшчэ большым умацаваньні, яшчэ большым падвышэньні баявой якасьці лінкора. Забясьпечце чырвонафлётцаў штодзённымі клопатамі, яшчэ больш популярызуйце флёт сярод шырокіх мас працоўных БССР.

У заключэньне мне хацелася сказаць, каб Х зьезд КСМ Беларусі быў пераломным момантам у палепшаньні работы па шэфству над лінкорам. КСМ Беларусі павінен заняцца пытаньнямі ўздыму баявой магутнасьці лінкора на вышэйшую ступень.

Няхай жыве комсамол—ударная брыгада 3-га году 5-годкі!

Няхай жыве комуністычная партыя—кіраўнік КСМ!



На здымку: прадстаўнікі лінкору „Пар. Комуна". Унізе зьлева на права т.т.: Наумаў (ЦК УсеЛКСМ), Ільлічоў (БВА), у сярэдзіне—сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Палякоў

Пад сьцягам ударніцтва і соцспаборніцтва

Вітаючы Х зьезд беларускага комсамолу, які праводзіцца ў момант найбольш абвостранага міжнароднага становішча, я сёньня хачу зрабіць кароткі агляд росту і дасягненьняў падшэфнага карабля „Парыская Комуна"—аднэй з найбольш магутных баявых адзінак, на долю якой выпадае адна з адказьнейшых задач па ахове морскіх межаў.

Пасьля свайго практычнага навучальнага плаваньня Кроншгадт—Севастопаль, якое праходзіла ў выключна цяжкіх абставінах зімовага пэрыяду 1929-30 году, зрабіўшы 7000-мільны пераход праз 6 мораў

Дэлегат зьезду т. Казакова М. (комуна „Прогрэс" Лёзьнянскага р.)

і акіян, пераможшы вялізны штурм, дасягаўшы 12 балаў, з хваляй у 15 мэтраў вышынёю, лінкор накіраваўся для рамонту некаторых папсаваньняў у базу чырвонаморскага флёту—г. Севастопаль.

Пасьля бурнай сустрэчы севастопальскім пролетарыятам, пасьля ўрачыстых дзён, прысьвечаных ударнаму завяршэньню практычнага плаваньня, пацяклі лінкораўскія будні.

„Рамонт правесьці сваімі сіламі на 80 проц., першага мая ўзьняць вымпел і выйсьці ў мора для працягваньня практычнага плаваньня", —было загадана Рэволюцыйным Ваенным Саветам. „Ёсьць",—адказала каманда і заліхвацкі пацякла работа. Разгарнула свой энэргічны і гнуткі апарат комсамольская організацыя, пры непасрэдным і цьвёрдым кіраўніцтве партыйнага колектыву. У два дні ўтвараюцца ўдарныя рамонтныя брыгады чырвонафлётцаў, разгарнулася шырока соцспаборніцтва, рота за ротай, машына за машынай абвяшчаюць сябе ўдарнымі, абганяючы адна адну ў выкананьні кантрольных лічбаў. Не адыходзячы ад мэханізмаў, ня вылазячы з качагаркі, часам праслухаўшы сыгнал на абед і вячэру, клапатліва разьбіраюць, прыганяюць, скрабуць і чысьцяць дэталі ўдарныя брыгады. Некаторыя таварышы, найбольш адказныя ў рабоце, уразумеўшы ўсю важнасьць і неабходнасьць сваё прысутнасьці пры разборцы мэханізмаў, адмовіліся на пэрыод рамонту ад чарговага водпуску, так неабходнага пасьля цяжкога пераходу.

Часу застаецца мала. Рамонт вялікі. Загад Рэввоенсавету непахісны. 1-га мая—у мора. Вось асноўныя мотывы, якія кіравалі чырвофлёцкай масай. І 1-га мая лінкор нарыхтаваўся да выхаду ў мора.

Гэта быў наш адказ рымскаму папе Пію XI на крыжовы паход супроць СССР.

Ня гледзячы на ўсю цяжкасьць плаваньня ва ўмовах паўднёвага клімату ў летнюю кампанію 30 году, калі ад сьпякоты і падагрэтага сваім уласным нараправодам паветра, дасягалася на лінкоры высокая тэмпэратура, мы мелі надта высокія, ударныя тэмпы вучэбна-баявой падрыхтоўкі. Поўная ўзгодненасьць работы ўсёй складанай электрыфікаванай сыстэмы на лінкоры, вялікія дасягненьні ў артылерыйскай стральбе, адсутнасьць якіх-колечы „заяланьняў", ці „закісаньняў" мэханізмаў у паходзе, дакладнае, чёткае і хуткае выкананьне загадаў, цьвёрдае выкананьне свайёй справы кожным чырвонафлётцам наасобку на сваім баявым месцы, рацыяналізацыя і вынаходства як адны з форм сустрэчнага баявога прамфінпляну ў бягучым рамонце,—вось тое што мы сёньня маем на лінкоры.

Ахопленыя партыйнай і палітычнай асьветай у розных гуртках, пабыўшы у чужаземных портах, чырвонафлётцы, разам з абвостранай клясавай нянавісьцю, набываюць шырокі сьветапогляд, які ўсё больш і больш павышае іх культурны рост.

Справядлівыя культурныя запатрабаваньні чырвонафлётцаў растуць з кожным днём, і часам карабель ня мае магчымасьці задаволіць гэтыя запросы, павінен здавальняцца тымі невялікімі рэсурсамі, якія мае ў сябе, ці знаходзіць выхад у той культурнай дапамозе, якую павінны і абавязаны аказаць шэфствуючыя над лінкорам організацыі.

Вось чаму Беларускі комсамол—старэйшы шэф лінкора—адыграўшы не малую ролю навышэньні баяздольнасьці лінкора, падводзячы вынік на Х-ым зьезьдзе, павінен зараз даць ясную і дакладную ўстаноўку ў справе далейшага замацаваньня шэфскай работы і, разглядаючы гэта пытаньне, як адзін з важнейшых фактараў умацаваньня баяздольнасьці лінкора, павінен вырашыць яго па-дзелавому і конкрэтна.

Дэлегат зьезду камандзір РКЧФ Арлоў.

З залі зьезду

Раніца 6-га студзеня

У залі зелявая абстаноўка. Няма мітусяніны кіно-опэратараў, юпітэры сіратліва пакінуты. Дэлегаты займаюць месца ў залі. Шуршаць газэтамі, жартуюць.

Група дэлегатаў зацягвае песьню. Весела і добра!

* Таварыш Гайдукевіч звоніць. Але дэлегаты не супакойваюцца: сьпевы, спрэчкі, шум...

— Таварышы, цішэй!

Нарэшце, цішыня. Дэлегаты ўмеюць жартаваць, але і ўмеюць працаваць. Зараз—час за працу, і яны падрыхтаваліся.

Галавы напружана выцягнуты. Слухаюць спрэчкі па дакладу т. Горкіча аб працы КІМ'у.

* Першым у спрэчках выступае гомельскі дэлегат т. Воўсянікаў. Да заключнае прамовы п сьпявае выказацца 23 чалавекі.

Усе прамоўцы, як адзін, падкрэсьліваюць, што комсамал Беларусі слаба працаваў па ўзмацненьню інтэрнацыянальнай сувязі.

* Гомельская дэлегацыя ўносіць у дапамогу замежнаму комсамолу 1500 рублёў.

Магілеўская дэлегацыя—1000 руб.

* У канцы ранішняга паседжаньня заслухоўваецца заключная прамова тав. Горкіча.

* Мільгаюць блёк-ноты. Бегаюць па паперы алоўкі. Дэлегаты фіксуюць, падкрэсьліваюць, адзначаюць усё тое, што ім неабходна, што патрэбна для працы.

* Побач са мною сядзіць дэлегат. Ён сэкратар колгаснай комсамольскай ячэйкі, ён ударнік і ўся „яго" ячэйка ўдарная. Прабую з ім загаварыць.

— Не перашкаджайце слухаць. Тут вельмі цікава і карысна. — Кіраўнік колгаснай ячэйкі нізка нахіляе галаў і паволі, малапісьменна, вялікімі каракулялі запісвае ў свой блёк-нот, прапановы дэлегатаў.

Я наглядаю за сваім суседам. Ён прагна глытае кожнае слова прамоўцы аб жыцьці і гэроічнай барацьбе замежнай комсамоліі і рабочай моладзі.

* ... Задача комсамолу—практычна заняцца пытаньнямі інтэрнацыянальнай сувязі, скончыў тав. Горкіч сваю заключную прамову.

* Ля трыбуны—дэлегаты інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу Лесбелу. Яны запэўніваюць зьезд у тым, што выканаюць усе ўскладзеныя на іх задачы.

* На сцэне 4 піонэры. Гэта—дэлегацыя Аршанскай піонэр-організацыі. Яна прыехала прывітаць вышэйшы орган комсамолу Беларусі Х усебеларускі зьезд комсамолу.

* Самы малы з дэлегатаў рэпартуе. У вялікай залі цішыня. А зьезд уважліва слухае маленькага аршанскага піонэра Міколу Мазеўскага, які звонкім голасам дакладвае яму аб праробленай піонэр організацыяй працы.

— Мы—твая верная зьмена, Ленінскі комсамол. Мы падрыхтавалі зьезду падарунак, зроблены ўласнымі рукамі.

Двое піонэрак пад гучныя воплескі авацыі перадаюць у прэзыдыум белае палотнішча з рознакалёрнай вышыўкай—прывітаньнем зьезду.

З адказным словам выступае тав. Пацукоў.

Штодзённымі клопатамі аб рабоце і жыцьці Чырвонай арміі і падшэфнага лінкору „Парыская Комуна" будзем мацаваць абароназдольнасьць краіны

ШЛЯХ КІМ--ШЛЯХ САМААДДАНАЙ Р...

Даклад тав. ГОРКІЧА аб рабоце К...

На трыбуне сэкратар КІМ'у тав. ГОРКІЧ

Таварышы! Дазвольце спачат у ад імя Выканкому КІМ, ад імя соцень і тысяч замежных комсамольцаў, ад імя соцень і тысяч працоўнай моладзі Захаду і Усходу перадаць рэволюцыйнае прывітаньне Х-му зьезду КСМ Беларусі.

За разьвіцьцём вашай краіны глядзяць, як ворагі, так і сябры пролетарыяту. Калі мы скажам, што работа Компартыі, КСМ, профсаюзаў і іншых грамадзкіх організацый Беларусі мае вялікае міжнароднае значэньне, дык гэта ня будзе перавялічэньнем. Дазвольце вам, як прадстаўніком таго пакаленьня і тых пластоў рабоча-сялянскай моладзі, якія ўжо змагаліся на фронце абароны Кастрычнікаўскай рэволюцыі з вінтоўкай у руках і якія, бязумоўна, па першаму закліку зноў стануць на перадавыя пасты абароны саветаў—гэтай адзінай бацькаўшчыны рабочых і сялян усяго сьвету,—расказаць коратка аб рабоце, аб становішчы і аб барацьбе, якую праводзяць вашы браты па клясе аб'яднаныя ў шэрагах КІМ'у.

Ворагі і пяцігодка

Усе ведаюць, што сьвет зараз не адзіны, ня толькі з пункту погляду палітычнага, але таксама і з пункту погляду экономічнага. Існуюць дзьве супроцьлеглыя сыстэмы, адна адну выключаючыя. Гэтыя дзьве сыстэмы паказваюць дзьве супроцьлеглыя лініі разьвіцьця. І вось, на працягу апошніх двух год відочна, на фоне разьвіцьця капіталізму і Савецкага Саюзу, вырысоўваецца малюнак гэтых дзьвёх ліній разьвіцьця. Адна лінія ідзе ўверх, другая лінія ідзе ўніз.

Калі 5-м зьездам Саветаў быў прыняты пяцігадовы плян соц. будаўніцтва, буржуазія падняла вялікі шум, раздаваліся крыкі, што гэты пяцігадовы плян—утопія; у лепшым выпадку чуліся рэдкія галасы аб тым, што правядзеньне пяцігадовага пляну будзе азначаць канец капіталізму.

Два гады прайшло... Як зараз рэагуе буржуазія, як зараз глядзяць нашы клясавыя ворагі на разьвіцьцё Савецкага Саюзу? Выкінутыя за борт грамадзкага прогрэсу, меншавіцкія і белаэміграцкія сабакі дагэтуль адмаўляюць якія-б то ні было посьпехі ў справе правядзеньня пяцігадовага пляну. Але больш дальнавідныя прадстаўнікі буржуазіі вельмі занепакоены тымі вялізарнымі посьпехамі, якія дасягнуты ў працягу першых двух год пяцігодкі Вы, напэўна, чыталі ў апошні час у газэтах аб тым, што адзін з натхніцеляў інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу ў 1930 г. — правадыр ангельскай буржуазіі Лёйд-Джордж напісаў з прычыны процэсу „прампартыі" вялікі артыкул. Вельмі цікава паслухаць думку гэтага кіраўніка сусьветнай буржуазіі аб справах у Савецкім Саюзе. Лёйд-Джордж у гэтым артыкуле піша:

„Комуністычныя правадыры ў Савецкім Саюзе пачалі праводзіць плян, які па аб'ёму і значэньню кідае ў цень усе вялікія і сьмелыя прадпрыемствы, якія дагэтуль ведала гісторыя чалавецтва. Справы Пятра Вялікага застаюцца бяз усякага значэньня ў параўнаньні з намерамі Сталіна".

У другім месцы ў тым жа самым артыкуле ён піша:

„Калі Сталіну ўдасца хаця-б у вялікай ступені прыблізіцца да выкананьня пяцігадовага пляну, ён зробіць звышчалавечую справу".

І гэты Лейд-Джордж махровы буржуа, падводзячы ў гэтым артыкуле вынікі пяцігодкі, прыводзіць усе лічбы ў процівагу таму паклёпу і той хлусьні, якая запаўняе старонкі фашысцкага буржуазнага друку ва ўсім сьвеце. Ён прыводзіць лічбы аб посьпехах правядзеньня пяцігодкі і артыкул свой заканчвае наступным пароцтвам:

„У кожным разе, Сталін робіць гісторыю ў вялікіх разьмерах. (Цікавы пункт погляду Лёйд Джорджа, што гэта робіць адзін чалавек). Калі яму ня ўдасца правесьці пяцігодку, комунізм будзе скомпромэтаваны на доўгі час. Але калі гэты плян будзе мець посьпех, тады комунізм уваходзіць у кола ідэй, ажыцьцявімасьць якіх даведзена і якую тады прыдзецца браць усур'ёз як у экономіцы, так і ў соцыялёгіі. У такім выпадку, у выпадку посьпеху, самым сур'ёзным вынікам гэтага посьпеху было-б тое, што Расія стане адной з самых багатых, з самых магутных краін сьвету.

Другі прадстаўнік буржуазіі, другі прадстаўнік соцыял-фашыстых, адзін з правадыроў ІІ-га Інтэрнацыяналу, вядомы пролетарыяту Савецкага Саюзу сваім выступленьнем у абарону эсэраў у пачатку рэволюцыі, выступіўшы на эсэраўскім процэсе ў якасьці абаронцы—Вандэрвэльдэ, які нядаўна быў у Кітаі, наведаў Савецкі Саюз, таксама ўблічна заяўляе з трыбуны бэльгійскага парляманту аб посьпехах пяцігодкі.

Тут, таварышы, у Савецкім Саюзе, на месцы, любы рабочы і селянін бачыць, якіх посьпехаў дасягае гэроізм мільёных мас у справе правядзеньня пяцігодкі. Гэтых мільёнаў нечага пераконваць у тым, што пяцігодка праводзіцца, і праводзіцца з перавыкананьнем, праводзіцца пасьпяхова. Але нам важна ведаць думку нашых клясавых ворагаў. Посьпехі настолькі вялікія, што клясавы вораг ня мае больш сьмеласьці паўсюды адмаўляць гэтыя посьпехі. Гэта адзін бок разьвіцьця, адзін бок фронту.

Сусьветны крызіс і яго немінучыя вынікі

Як стаіць справа па той бок граніцы? Статыстычных даных аб сусьветным крызісе я прыводзіць ня буду, абмяжуюся толькі тым, што ўкажу 3-4 лічбы адносна падзеньня валавой продукцыі ў важнейшых капіталістычных краінах. У чэрвені 1930 году, у параўнаньні з чэрвенем 1929 году мы мелі ў Нямеччыне падзеньне ўсёй продукцыі на 24.1 проц; у Англіі на 13,6 проц. у Польшчы—на 26 проц. і ў Злучаных Штатах Амэрыкі на 22,5-проц. Гэта даныя за чэрвень 1930 г. З таго часу гэтыя паказчыкі яшчэ больш зьнізіліся, з таго часу паказчыкі разьвіцьця ў Савецкім Саюзе яшчэ больш павысіліся. Вам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на лічбы, якія гавораць аб становішчы ў Польшчы. Комсамол у сваёй робоце па мобілізацыі мас на выкананьне пяцігодкі павінен параўнаць гэтыя даныя з разьвіцьцём становішча ў Савецкім Саюзе, з разьвіцьцём становішча на Беларусі. Даволі глянуць на Зах. Беларусь, даволі кінуць адзін позірк на Польшчу, каб адразу ўбачыць вялікую розьніцу, як у стане працоўнага насельніцтва, так і агульным экономічным і політычным стане. Там разруха, там зьмяншэньне продукцыі, там пагоршаньне становішча працоўных, а тут на Беларусі—сталы рост дабрабыту насельніцтва, сталы рост народных прыбыткаў.

Мецца сталы рост капітальнага будаўніцтва.

Якія вывады можна зрабіць з пункту погляду міжнароднай клясавай барацьбы з існуючага крызісу?

Па-першае, буржуазія імкнецца і будзе імкнуцца выехаць за кошт працоўных, за кошт пераладжэньня ўсіх цяжараў і цяжкасьцяй крызісу, якія маюцца, на сьпіну рабочае клясы, на сьпіну сялянства, на сьпіну працоўнага насельніцтва колёніяльных краін. Гэта будзе азначаць і ўжо азначае грандыёзнае ўзмацненьне і абвастраньне ўнутраных супярэчнасьцяй капіталізму.

Па-другое, ідзе барацьба за новы перадзел сьвету. Ужо адбываюцца войны, хаця-б у форме так званых рэволюцый ў Паўднёвай Амэрыцы, якія нічога іншага не азначаюць, як барацьбу між Англіяй і ПАЗШ за гегемонію, за рынкі збыту, за крыніцы сыравіны на Паўднёва-Амэрыканскім сухазем'і. Гэта азначае абвастраньне знадворных супярэчнасьцяй капіталізму па ўсіх лініях.

І нарэшце, буржуазія і сусьветны імпэрыялізм хочуць выехаць за кошт Савецкага Саюзу. Вось таму ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка інтэрвэнцыі, таму мы бачым узмоцненыя работы шкоднікаў і г. д. Апошнія процэсы ў СССР (процэс „Прамысловай партыі", арышты контрэволюцыянэраў з групы Кандрацьцева, арышты нацыянал-дэмократаў у Беларусі, фашысцкія перавароты ў шэрагу эўропэйскіх краін,—усё гэта гаворыць аб тым, што ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка інтэрвэнцыі. Тут можна ўспомніць нядаўна выказаныя словы Пілсудзкім. Калі да яго прышлі скардзіцца на беспрацоўе, тады ён заявіў, што ў самім хуткім часе беспрацоўе зьнікне,—ён меў на ўвазе вайну.

Уплыў сусьветнага крызісу на становішча і барацьбу рабочай моладзі

Неабходна зьвярнуць вашу ўвагу на тое, як гэты сусьветны крызіс уплывае на моладзь, якое становішча рабочай моладзі ў шэрагу краін.

У выніку гэтага сусьветнага крызісу, як праходзіць і ў якім становішчы знаходзіцца барацьба за моладзь за ўмовах гэтага крызісу. Тут я возьму толькі некалькі паказчыкаў.

Першы паказчык тут—гэта капіталістычная рацыяналізацыя.

Якая зараз роля моладзі ў вытворчасьці? Трэба сказаць, што за апошнія 3-4 гады яна з году ў год узмацняецца. Напрыклад, возьмем Нямеччыну.

Калі 3 гады таму назад сярод усіх застрахаваных рабочых складала 6 проц., дык к канцу 1928 году яна складае ўжо 28 проц. Затым возьмем Англію. Возьмем паказчыкі становішча рабочае моладзі ў Паўднёвым Уэльсе: у 1928 г. на 100 тыс. рабочых было 22 проц моладзі, дык з раз, у 930 г. моладзь складае 35 проц. У Польшчы ў мэталаапрацоўчай прамысловасьці моладзь складае зараз 40 проц., у вугальнай прамысловасьці—25 проц., у шкляной прамысловасьці дзеці і дзяўчаты складаюць 80 проц., у тэкстыльнай прамысловасьці—адна трэць усіх рабочых складаюць маладыя рабочыя. Такія-ж паказчыкі мы маем і па ўсіх іншых краінах. Асабліва моцная эксплёатацыя моладзі ў каляніяльных краінах, на ўсходніх краінах ёсьць некаторыя галіны прамысловасьці, рабочая моладзь у якіх складае да 60 да 80 проц. Напрыклад, у Кітаі ў тэкстыльнай прамысловасьці моладзь складае 60-70 проц., у шоўкавай прамысловасьці складае 80 проц., у тытунёвай прамысловасьці—65 проц. У Інда-Кітаі моладзь складае 65 проц. усяе рабочае клясы.

Паглядзім, як стаіць справа з зарплатай? Параўнаем становішча ў паасобных краінах па апошняй статыстыцы Міжнароднага Бюро Працы Нацый з адносна важнейшых краін. Возьмем за аснову зарплату ангельскіх рабочых, раўнуючы яе за 100 адзінак. Дык калі ў Англіі рабочы атрымае 10 адзінак, то ў Амэрыцы 188, у Канадзе—157, у Нямеччыне—74, у Голяндыі—84, у Ірляндыі—85, у Польшчы—66. Трэба сказаць, што Польшча належыць да краін, дзе рабочая кляса аплачваецца вельмі нізка. Гэта адна з самых апошніх краін у Эўропе адносна аплаты рабочае клясы.

Якое-ж становішча моладзі адносна зарплаты? Няхай рабочая моладзь Савецкага Саюзу ведае аб этым, няхай ведае рабочая моладзь Беларусі, якая ў большасьці сваёй не працавала на фабрыках ў часе царскага рэжыму,—няхай яна ведае як жывецца рабочай моладзі за межамі. Паўсюду, дзе, дзякуючы капіталістычнай рацыяналізацыі замест дарослых рабочых працуюць маладыя рабочыя, яны, выконваючы работу першых, атрымліваюць больш нізкую заработную плату.

Маладыя рабочыя атрымліваюць больш нізкую заработную плату паўсюды ў капіталістычных краінах, але не таму што яны належаць да больш нізкай катэгорыі рабочых ў сэнсе вытворчасьці працы, а ў сілу свайго юнацкага ўзросту. Маладыя гарнаробочыя у Нямеччыне, пры напружанай работы, якая ўяўляе сабою небясьпеку для жыцьця, зарабляюць у тыдзень ад 12 да 15 марак (марк —50 к.), працуючы з поўнай нагрузкай. Маладыя мэталістыя атрымліваюць ад 12 да 16 марак у тыдзень, гэта значыць 6-8 р. На аднэй з буйнейшых фабрык у Рэйнскай вобласьці, дзе моладзь складае 75 проц. усе маладыя рабочыя да 16 год працуюць 40 гадзін у тыдзень і атрымліваюць 7 марак, значыць 3 з палов. руб. у тыдзень.

Некалькі лічбаў аб Польшчы. У Варшаве, згодна офіцыйных даных, месячная зарплата 41 проц. рабочых—менш 100 злотых, г. зн. меней 22 руб. У Лодзінскай тэкстыльнай прамысловасьці маладыя тэкстыльшчык зарабляе ў сярэднім 1 злоты ў дзень, пры зьдзельнай рабоце—1,20 злота г. Такім чынам, працуючы цэлы месяц, а трэба ведаць, што кожны другі рабочы працуе 2 тыдні на працягу месяцу, зарабляе каля 35 злотых, альбо 8 р. у месяц.

У Канадзе, па вылічэньнях буржуазных інстытутаў, жыцьцёвы мінімум для рабочага складае 18 даляраў, а рабочая моладзь зарабляе самае большае 15 даляраў, прычым большасьць зарабляе 5-7 даляраў.

Некалькі лічбаў аб Францыі. Заработная плата моладзі да 18 год складае 1-3 франкі, для моладзі да 20 год 3-4 франкі. Маладыя тэкстыльшчыкі да 18 год зарабляе за 2 тыдні 120 франкаў, гэта прыблізна 6-7 р. У прамысловых акругах зарплата трохі вышэй, але ўсё-ж недастатковая—110-120 франкаў, гэта 8-10 руб. за 2 тыдні, г. зн. 20 р. у м-ц.

Зараз, у апошні час, у сувязі з крызісам, паўсюды назіраецца наступленьне капіталістаў, паўсюды ідзе зьніжэньне заработнай платы. Рабочых прымушаюць [illegible]. Апошні бой маладых рабочых у Берліне, бой гарнякоў, які зараз адбываецца у Руры і паўднёвым Уэльсе сьведчаць аб тым, што сусьветная буржуазія перайшла на ўсім фронце ў наступленьне на новыя працы і зарплату рабочых.

Мы маем за апошні год вялікі рост юнацкіх забастовак амаль па ўсіх краінах. Ніколі да гэтуль не было так многа юнацкіх забастовак, [illegible] вялікую колькасьць юнакоў, якія канчаюцца часта ня [illegible] пасьпехам, як на працягу апошняга году.

Як стаіць справа з рабочым днём моладзі? Прыклад некалькіх лічбаў. У Нямеччыне, Дрэздэне, была наладжана выстаўка па гігіене. На гэтай выстаўцы выявілася, што 40 проц. нямецкай моладзі працуе звыш 48 гадзін у тыдзень і кожны 8 з маладых рабочых прымушаны працаваць на нядзелях.

Згодна даных ЦК нямецкага саюзу моладзі, гэта буржуазнага аб'яднаньня, праца рабочай моладзі да 18 год разьмяркоўваецца наступным чынам: толькі 30 проц. моладзі працуе 8 гадзін, 30 проц. працуе 9 гадзін у дзень і 40 проц. рабочай моладзі працуе 10 і больш 10 гадзін у дзень. Па даных, буржуазнага падходжаньня, па Саксоніі ўстаноўлена, што ня менш 26 проц. маладых рабочых Саксоніі працуюць 66 гадзін у тыдзень, а 39 з паловай проц. працуе звыш 48 гадзін у тыдзень.

Зараз, калі ў Нямеччыне пануе беспрацоўе, вынесена рашэньне, што рабочы дзень моладзі павялічваецца ў шэрагу заводаў, у шэрагу галін прамысловасьці да 51 гадз. у тыдзень.

Становішча рабочай моладзі характарызуюць наступныя даныя аб захворваньні і няшчасных выпадках. У бальнічнай касе крупаўскіх заводаў, якія вырабляюць амуніцыю, на кожныя 100 рабочых у 1927 г. было зарэгістравана хворых ва ўзросьце да 20 год—80 проц., ад 20 да 30 год—68 проц. і далей процант зьмяншчаецца.

Рабочая моладзь больш усяго хварэе ад няшчасных выпадкаў. На сталеліцейным заводзе ў Дортмуне 57 проц. усіх няшчасных выпадкаў адносіцца да моладзі ад 16 да 21 году.

Як стаіць справа з беспрацоўем? Агульная колькасьць беспрацоўных ва ўсім сьвеце зараз дасягае лічбы ў 30 мільёнаў, гэта ў той момант, калі ў Савецкім Саюзе беспрацоўе цалкам і поўнасьцю ліквідавана. З гэтых 30 мільёнаў беспрацоўных ня менш 7 мільёнаў моладзі да 21 году, прычым трэба мець на ўвае, што гэта не кульмінацыйны пункт беспрацоўя, што беспрацоўе пашыраецца далей.

Агульны процант беспрацоўнай моладзі, з усёй колькасьці беспрацоўнай хістаецца ад 20 да 40 проц. Асабліва церпіць ад беспрацоўя моладзь ад 18 і старэй. 18-гадовы юнак заграніцах, скончыўшы сваё абучэньне, прэтэндуе на стаўку падручнага, і вось тады прадпрыемца звальняе гэтага рабочага, замяняючы яго 12-14-гадовым маладым рабочым, які абыходзіцца яму танней. Так стаіць справа ва ўсіх краінах. Асабліва рэзка ставіцца гэта проблем для Скандынаўскіх краін, а ў іх краінах сьвету мы маем пэрманэнтна растучае беспрацоўе сярод моладзі, якая яшчэ не увайшла ў вытворчасьць якая ня можа знайсьці месца ў вытворчасьці. Калі дзесяткі-сотні маладых рабочых не працуюць, дык яны і ня маюць надзеі атрымаць работу ў маладосьці, ня могуць знайсьці сабе заработку.

Становішча маладых беспрацоўных пагаршаецца тым, што маладыя беспрацоўны не атрымлівае нават тае маленькае дапамогі, якую атрымлівае ў некаторых краінах дарослы рабочы. У шмат якіх краінах, дзе наогул яшчэ няма дзяржаўнай дапамогі беспрацоўным, там моладзь зусім ні ад каго і нічога не атрымлівае. Так стаіць справа з 2 міл. арміяй беспрацоўных—моладзі ў Злучаных Штатах Амэрыкі.

У Нямеччыне, згодна апошніх даных, моладзь, маладзей 18 год, наогул не атрымлівае дапамогі, а зараз ёсьць проэкт, каб моладзь, маладзей 21 году, была пазбаўлена так званай крызіснай дапамогі (дапамога, якая даецца на працягу 26 тыдняў пасьля страты работы). У Аўстрыі выдаецца новы закон, які пазбаўляе рабочых, маладзей 18 год, атрымліваць дапамогу, а маладзей 21 павінны атрымліваць дапамогу толькі пасьля 13 тыдняў беспрацоўя. У Польшчы рабочыя, маладзей 18 год, наогул дапамогі не атрымліваюць. Паўсюды моладзь атрымлівае дапамогу ў меншым памеры, чым дарослыя рабочыя. Нават і гэтыя маленькія дапамогі ў некаторых краінах (Англія, Нямеччына) знаходзяцца пад пагрозай ануляваньня, таму што гэтыя дапамогі ставяцца ў залежнасьць ад наведваньня беспрацоўнай моладзьдзю так званых профкурсаў, дзе моладзь не праходзіць проф. навучаньня, а падпарадкаваецца ўплыву фашызму і фашысцкіх настаўнікаў. Амаль ва ўсіх краінах ахтуецца ўвядзеньне аб вяковай працадысцыпліны, што зьяўляецца скрытай формай мілітарызацыі моладзі. У шэрагу краін беспрацоўная моладзь прымушана працаваць па 8-10 гадзін, атрымліваючы, напрыклад у Нямеччыне, па тры маркі ў дзень.

Я вам паказаў некалькі характэрных цыфр. Параўнайце гэтыя даныя з становішчам моладзі ў Савецкім Саюзе. Адначасна з гэтым пагоршаньня становішча рабочай моладзі ў капіталістычных краінах, мы маем паўсюды ўзмацненьне барацьбы за моладзь між буржуазіяй і пролетарыятам. Соцыял-фашысты пачынаюць удзяляць проблеме моладзі больш увагі, і асабліва імкнуцца заваяваць маладых рабочых праз усякага роду дапаможныя організацыі Фашыстыя ва ўсіх краінах концэнтруюць сваю ўвагу на моладзь. Фашызм у Італіі толькі ў 1930 годзе пачаў утвараць масавыя фашысцкія організацыі для моладзі ва ўзросьце ад 18 да 21 году. У Нямеччыне фашызму ўдалося ў пэўных пластох моладзі заваяваць сабе той ці іншы ўплыў: з баявых фашысцкіх дружын у Нямеччыне 50 проц. складае моладзь, прычым сярод яе ёсьць такія пласты, якія павінны змагацца разам з компартыяй. Мы маем таксама яўнае ўзмацненьне ва ўсіх краінах шматколькасных рэлігійных організацый моладзі, якія прымаюць актыўны ўдзел у агульнай ідэолёгічнай падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Ідзе паўсюднае ўзмацненьне рэпрэсій супроць комсамолу, што зьяўляецца адзнакай абвастраньня барацьбы за моладзь. У большасьці краін, асабліва тых, якія будуць адыгрываць вельмі актыўную ролю ў барацьбе супроць Савецкага Саюзу, праводзіцца даваеннае абучэньне моладзі і паўсёдная мілітарызацыя моладзі. Буйнейшыя правадыры буржуазіі зараз пачалі займацца пытаньнямі моладзі і ставяць проблемы моладзі, як адну з актуальнейшых задач дня, бо яны разумеюць, што ў надыходзячых гістарычных клясавых сутычках моладзь адыграе рашаючую ролю.

Вось, якія таварышы, агульныя ўмовы, у якіх прыходзіцца працаваць і разьвіваць барацьбу КІМ'у і ўсім сэкцыям КІМ'у.

Становішча КІМ'у

Коратка аб дзейнасьці КІМ'у. Год таму назад на лістападаўскім пленуму КІМ'у было прызнана становішча КІМ'у нездавальняючым. Мы, бальшавікі, не баімся самакрытыкі і ўмеем глядзець праўдзе ў вочы. Год таму назад становішча КІМ'у зьяўлялася нездавальняючым. Чаму? Таму што ў той час у 4-х сэкцыях КІМ'у (Ангельшчына, Чэха-Славакія, Нарвэгія і Аўстрыя) існавалі крызісы. Гэтае становішча было нездавальняючае таму, што зьменшыўся ўплыў організацыі КСМ на заводах амаль ва ўсіх краінах. Увесь КІМ, з пункту погляду колькасьці, ішоў назад. Было падзеньне

...рэвалюцыйнай барацьбы

...Комуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі

...не колькасьці членаў КІМ'у ў важнейшых саюзах. Увесь КІМ адставаў ад тэмпаў разгортваньня агульнай барацьбы.

Якія прычыны гэтага становішча?

Прычын шмат. Успомню толькі галоўнейшыя. Перш за ўсё, гэта—неразуменьне характару комсамолу, як шырокай масавай, баявой, комуністычнай, выхаваўчай арганізацыі, якая зьяўляецца па свайму характару, скажам, г. д. шырэйшай, чым компартыя. Наколькі ненормальна становішча ў гэтых адносінах яшчэ да гэтага часу, паказваюць наступныя лічбы. Вам усім вядома, што ў комсамоле павінна быць больш членаў, чым, напрыклад, у партыі. А як стаіць справа з гэтым у капіталістычных краінах? Вось лічбы за 1929-30 г. Нямецкі комсамол складаў толькі 19,6 проц. у адносінах да агульнага ліку членаў партыі, г. зн.—у пяць разоў менш партыі; чэхаславацкі комсамол складаў 10,6 проц., г. зн. у 10 разоў менш чым партыя; французскі комсамол 12,3 проц. у адносінах да партыі, г. зн.—у 8 разоў менш, чым компартыя; шведзкі комсамол складаў 60 проц., ангельскі комсамол—12,5 проц. агульнае колькасьці членаў партыі. Значыць, замест таго, каб комсамол колькасна быў больш партыі, гэтыя саюзы комсамолу аказваліся ў 5, 6, 10 і 12 разоў менш чым адпаведныя компартыі. Прычыны гэтага хаваюцца ў тым, што комсамол ня меў правільнай установкі, што работа комсамолу праходзіла не пад кутом погляду арганізацыі яго як шырокай дапаможнай арганізацыі комуністычнай партыі, і больш шырокай масавай арганізацыі.

Другая прычына ў тым, што КСМ у сваёй практыцы ня выжыў авангардысцкай установкі. Яшчэ да гэтага часу праяўляецца дзе-ні-дзе гэтая авангардысцкая ўстаноўка, якая шкодзіць пераўтварэньню КСМ у масавую арганізацыю.

Трэцяя прычына: адсутнасьць барацьбы на 2 фронты і ў асаблівасьці барацьбы супроць „левай" фразы і сэктанцтва. КІМ змагаўся заўсёды ў першых шэрагах за правядзеньне генэральнай лініі КІМ, але ў сябе на справе барацьбы супроць „левых" забыў да лістападаўскага пленуму ня...еў.

Маюцца дасягненьні безумоўна. Якія гэта дасягненьні? Я пералічу важнейшыя: па першае, барацьба на два фронты разгорнута ўсюды, пачынаючы ад Выканкому і канчаючы ніжэйшымі арганізацыямі. Ад...асноўнай установкі КСМ. У рабоце КСМ адхілены шэраг нягодных актывістых, якія зьявіліся носьбітамі сэктанскай установкі?

Патрэбна адзначыць, што да лістападаўскага пленуму Кім'у крывая Кім'у ішла назад. Быў крызіс у Аўстрыі, Ангельшчыне, Чэха-Славакіі і Нарвэгіі. У Нарвэгіі крызіс цягнецца зараз. Вялікія дасягненьні зараз маюцца ў нямецкім КСМ, а таксама польскім. Кой якія посьпехі, якія патрэбна адзначыць, маюцца ў Ангельшчыне, ...отым мы маем у шэрагу нелегальных краін дасягненьні ў арганізацыі КСМ. У Гішпаніі за апошні час цыя комсамольская арганізацыя нагул узрасьлі. У Італіі патроіліся, у Аўстрыі падвоіліся, у Румыніі колькасьць членаў узрасла. Вялікія посьпехі маюцца ў Кітаі.

Агульная колькасьць Кім'у ва ўсіх краінах у час лістападаўскага пленуму была роўна 89954 членам, у сакавіку 30 году—96620 чал., у ліпені 30 году—99880 ч., і нарэшце, у кастрычніку 30 году—104 тыс. чал. Значыцца рух назад спынен. Маецца вялікая тэндэнцыя разьвіцьця ўперад.

Далей ёсьць дасягненьні ў адносінах забастовак. КСМ павярнуўся тварам да забастовак. Гэта паказвае стачка ў Бэрліне.

Пасьля лістападаўскага пленуму атрымалася шырокае разьмеркаваньне шэрагу новых форм работы, як соц. спаборніцтва, ударніцтва і інш. У шэрагу краін, у прыватнасьці ў Нямеччыне, пачынаецца конкрэтная барацьба па разбраеньню фашысцкай арганізацыі. Да лістападаўскага пленуму такой работы не вялося. Вам відома аб тым, што ў выніку работы КСМ распушчана бэрлінская арганізацыя маладых соцыялістых, што маецца цэлы шэраг маладых комсамольцаў, якія перышлі ў КСМ з соцсамолу.

Нешта дасягнута і ў адносінах паляпшэньня ўзаемаадносін паміж партыяй і КСМ. У асаблівасьці партыя Нямеччыны моцна кіруе і дапамагае КСМ.

Раней было вельмі шмат пустазвонства, хвальбы паміж комсамольцаў.

Зараз гэта наглядаецца ўсё радзей і радзей, зараз прасачылася ў нізы бальшавіцкая самакрытыка. Гэта дасягненьне, якое неабходна адзначыць. Ці павінны мы быць задаволены гэтымі дасягненьнямі? Зразумела. Але гэтага яшчэ мала ў параўнаньні з тымі запатрабаваньнямі, якія стаяць перад кожнай КСМ перад кожнай ячэйкай.

Мы маем вобласьці, дзе КСМ не шавеліцца. Якія гэта вобласьці? У буйных прадпрыемствах палепшаньня няма. На справе КСМ не павярнуўся тварам да буйных заводаў.

Работа ў арміі, антымілітарысцкая работа нездавальняючая.

Работа ў рознага роду масавых організацыях: спорт., культурных, атэістычных — гэта работа яшчэ знаходзіцца ў загоне. Пералому няма. Профсаюзная работа слабая. У часе стачак комсамол разьвівае вялікую дзейнасьць, але комсамол яшчэ ў большасьці выпадкаў ня ўмее дасягнутыя ў час стачак поспехі, організацыйна замацаваць. Тыя „ножніцы", тое разыходжаньне, якое існуе паміж уплывам комсамолу і паміж яго організацыяй—усё яшчэ вялікае. — Я для ілюстрацыі прывяду прыклад правядзеньня 13 МЮД'у. У комсамоле, напрыклад, у Нямеччыне—30000 членаў, а ў дэманстрацыях у дзень МЮД'у ўдзельнічала 160 тысяч членаў, у амэрыканскім комсамоле каля 2000 членаў, а ў дэманстрацыях удзельнічала пад лёзунгамі і сьцягамі комсамолу 100000 маладых рабочых, у Чэха-Славакіі ў комсамоле 5000 у дэманстрацыі ўдзельнічала 30000 і г. д. і г. д.

Значыцца, прыблізна такі малюнак: радыус уплыву комсамолу вялікі, але гэты ўплыў ня выкарыстаны нава і ў мінімальнай ступені для організацыйнага ўмацаваньня самога комсамолу. Шэраг слабасьцяй яшчэ маецца ў галіне прымяненьня юнацкай політыкі ў частцы пераводу агульна-палітычных лёзунгаў маладых рабочых на агульназразумелую мову. У прыватнасьці сустракаюцца такія зьявішчы, што які-небудзь лёзунг „гуляе" ад ЦК да акруговых камітэтаў і ячэек без дастатковай конкрэтызацыі. Наш комсамол ня ўмее фармуляваць свае патрабаваньні так узяцца за справу, каб масы моладзі, выходзячы з іх мобілізацыі за частковыя патрабаваньні, уцягнуць у барацьбу за агульныя клясавыя інтарэсы рабочай моладзі.

Зараз патрэбна ўдарным парадкам ліквідаваць гэтыя вузкія месцы ў рабоце КІМ'у. Наце адзе пляну павінны знаходзіцца пытаньні барацьбы супроць інтэрвэнцыі, барацьбы супроць фашызму, за організацыю шырокіх мас рабочае моладзі, уцягненьня самых шырокіх пластоў гэтай моладзі ў разгортваючуюся, паглыбляючуюся барацьбу рабочае клясы, супроць наступу сусьветнай буржуазіі на рабочую клясу.

Паварот у КСМ і задачы КСМБ

Вось коратка становішча КІМ'у. Даклад КІМ'у вам патрэбна тут абгаварыць. Кожны комсамолец павінен прымаць актыўны ўдзел у рабоце кожнай комсамольскай ячэйкі, павінен прымаць актыўны ўдзел у справе правядзеньня павароту ў КІМ'е. Ня правільна думаць, што паварот, які КІМ праводзіць, які ён павінен ажыцьцёвіць у самы бліжэйшы гістарычны тэрмін, зьяўляецца справай толькі асобных секцый КІМ'у. Роля УсеЛКСМ, роля вашага беларускага комсамолу ў правядзеньні гэтага павароту таксама вялікая.

Якія лініі, якія формы ўдзелу комсамолу ў правядзеньні павароту ў КІМ'е, якія формы вашай дапамогі, як краіны, дзе ўжо існуе пролетарская дыктатура комсамолу той краіны, дзе толькі вядзецца барацьба за гэтую дыктатуру? Перш за ўсё, гэта вопыт вашай масавай работы. Асноўныя вехі разьвіцьця КІМ'у характарызуюцца якраз тым, што КІМ можа, акрамя свайго ўласнага вопыту, чэрпаць яшчэ вельмі шмат і каштоўнага з вопыту УсеЛКСМ таму што УсеЛКСМ зьяўляецца прыкладнай масавай организацыяй.

Дэлегат зьезду, сакратар колгаснай ячэйкі ЛКСМБ тав. Грышаноў (Магілеўскі р-н)

Патрэбна дабіцца таго, каб кожная комсамольская организацыя УсеЛКСМ, кожная комсамольская организацыя ў Беларусі, кожная ячэйка абгаварылі ўсе пытаньні КІМ'у ў сябе на ячэйцы. Неабходна дабіцца таго, каб такзваная інтэрнацыянальная работа не зьявілася монополіяй толькі невялікай групы энтузіястых, невялікай групы работнікаў інтэрнацыянальнага выхаваньня. Тое, што мае комсамол ад ўсіх другіх плыняй у рабочым руху—гэта ёсьць якраз яго інтэрнацыянальны характар, і комсамол павінен у сваёй штодзённай рабоце праяўляць гэты інтэрнацыянальны характар.

Далей, рэволюцыйнае спаборніцтва з рознымі организацыямі, сэкцыямі ячэек у іншых краінах. Гэта адна з важнейшых форм нашай непасрэднай дапамогі организацыям заграніцы ў абгаварэньні ўсіх пытаньняў дзейнасьці гэтых организацый, забясьпечаньне магчымасьці праставнікам організацыі, з якім вы спаборнічаеце, асабіста азнаёміцца з вопытам вашай работы.

Наступная форма—гэта перапіска паміж ячэйкамі. Таварышы, гэта ня простая справа, як-бы сказаць—агульнай с лідарнасьці, паслаць ліст у ячэйку заграніцай. Гэты ліст мае вялізарнае політычнае значэньне. Кожны ліст, які пададе ў ячэйку заграніцай, абгаварвае ня толькі ячэйка, абгаварвае ўся заводзкая моладзь таму, што любы рабочы павінен цікавіцца і на справе цікавіцца тым, як стаіць справа ў Савецкім Саюзе і цікавіцца ня толькі на падставе таго, што прыпадносіцца ў газэтах, а такімі лістамі. І калі атрымоўваецца ліст ад рабочай моладзі Савецкага Саюзу гэты ліст можа ўзварушыць, можа завяваць усіх маладых рабочых на адным заводзе. З пункту погляду перадачы вопыту ў лісьце вы можаце расказаць як працуе ячэйка, як працуе бюро, як уцягваецца ў актыўную работу ўся комсамольская ячэйка, як ячэйка спраўляецца з пытаньнямі вытворчасьці, як ячэйка сочыць за разьвіцьцём новаўступаючых членаў у комсамол, бо гэта зьяўляецца вельмі хворым пытаньнем, бо ячэйкі заграніцай ня ўмеюць утрымаць у сваіх шэрагах новых членаў. Кожны такі ліст можа аказаць вялізарную дапамогу ў любой ячэйцы вашага братэрскага саюзу. Можна і патрэбна расіць ячэйкі братэрскага саюзу, няхай яны напішуць вашым ячэйкам справаздачу аб сваёй дзейнасьці. Вы гэтую справаздачу ў сябе абгаворыце, зробіце свае адзнакі і падзяліцеся вопытам, тым самым вы дасьцё магчымасьць зрабіць гэты паварот у КІМ'е.

Далей патрэбна і можна наладзіць абмен таксама раённымі газэтамі, падручнікамі, літаратурай. Магчыма і патрэбна ўвязваць ударныя брыгады тут і заграніцай, магчыма наладжваць сумеснае супрацоўніцтва. Усё гэта зьяўляецца рэальнай формай дапамогі ў правядзеньні павароту заграніцай. Ёсьць яшчэ шэраг асобных форм, я ўспомніў толькі некаторыя.

Чым дапамагчы разьвіцьцю сусьветнай рэволюцыі?

Падых дажу да канца. Часта таварышы задаюць пытаньні, калі абгаварваецца становішча заграніцай КІМ'у ці Комінтэрну: калі-ж нарэшце, будзе сусьветная рэволюцыя? Вось ужо надыходзіць 14-ы год з часу Кастрычнікавай рэволюцыі, а сусьветнай рэволюцыі ўсё няма і няма.

Няправільна так думаць. Сусьветная рэволюцыя ёсьць. Кастрычнікавая рэволюцыя—гэта пачатак, гэта складае частку сусьветнай рэволюцыі. Тое, што зараз адбываецца ў Кітаі — гэта таксама складае частку сусьветнай рэволюцыі, тое, што зараз адбываецца ў Індыі—гэта таксама складае частку сусьветнай рэволюцыі. Любая стачка ва ўмовах трэцяга пэрыоду можа зьявіцца пачаткам рашаючых падзей.

Ленін, калі ставілася пытаньне аб тэрмінах сусьветнай рэволюцыі, адказаў на гэта наступным чынам:— „Мы верым у рэволюцыю на Захадзе, мы ведаем, што яна непазьбежна, але па-заказу стварыць немагчыма. Няўжо мы ў сьнежні 1917 году мелі магчымасьць з дакладнасьцю ведаць аб надыходзячых лютаўскіх днях? Няўжо мы ў верасьні ведалі напэўна аб тым, што праз месяц рэволюцыйная дэмократыя ў Расіі зробіць найвялікшы ў сьвеце паварот?.. Мы ведалі, што старая ўлада знаходзіцца на вулькане. Па многіх адзнаках мы ўгадвалі аб тэй падземнай рабоце, якая адбывалася ў нетрах народнай сьвядомасьці. Мы адчувалі ў паветры накапляўшуюся электрычнасьць. Мы ведалі, што яна разразіцца непазьбежнай навальніцай, але прарочыць аб дні рэволюцыі мы не маглі і ня можам" (Том ХУ, стар. 28). Той-жа самы малюнак і на Захадзе: та рэволюцыя можа быць праз 5 месяцаў, можа і праз год, але тут гадаць нельга.

У чым павінна выявіцца дапамога кожнага беларускага комсамольца ў справе разгортваньня сусьветнай рэволюцыі? Усе мы горача жадаем, усе мы горача хочам хутчэй узяцца за вінтоўку і пайсьці на дапамогу сваім братом Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, Польшчы, Нямеччыны і інш. краін. Усе мы зьяўляемся салдатамі міжнароднай пролетарскай рэволюцыі але гэтай рэволюцыі яшчэ няма. Нельга сказаць дакладна аб тэрміне, калі надыйдзе, але гістарычныя тэрміны вельмі скарочаны. Ленін вызначыў так нашы задачы ў пэрыод, пакуль не пачнецца рэволюцыя ў Нямеччына і ў іншых краінах. Гэтыя задачы, азначаныя тав. Леніным, мы павінны памятаць у нашай рабоце. Ён гаворыць:—гадаць наконт гэтага, наконт пачатку рэволюцыі мы ня можам. Зараз галоўнае сваё ўзьдзейнічаньне на міжнародную рэволюцыю мы аказваем сваёй гаспадарчай політыкай. Усе глядзяць на Савецкую Рэспубліку, усё працоўныя ва ўсіх краінах сьвету, бяз усякага выключэньня і бяз усякага пераўвялічэньня. Гэтыя дасягненьні замоўчаць і захаваць капіталістыя ня могуць. Яны хочуць выкарыстаць нашы паасобныя памылкі, нашу слабасьць. На гэтай глебе барацьба перанесена ў сусьветным маштабе. Вырашым мы гэтую задачу,—тады мы выйгралі ў міжнародным маштабе напэўна і канчаткова. Дзеля гэтага пытаньні гаспадарчага будаўніцтва набываюць для нас значэньне зусім выключнае". (Том ХУІІІ, ч. І, стар 282)

Правядзеньне пяцігодкі—гэта адна з лепшых форм дапамогі міжнароднай рэволюцыі. Таму сьледуйце гэтым запаветам Леніна: сьпяшайцёся выканаць і перавыканаць пляны, выканаць пяцігодку ў чатыры гады, стаць ударнікамі, кожны на сваім вучастку барацьбы, умацоўваць абароназдольнасьць вашай краіны, умацоўваць міжнародную сувязь, выхоўваць у масах рабочай працоўнай моладзі дух рэволюцыйнага інтэрнацыяналізму, праводзіць генэральную лінію нашай партыі супроць усялякіх ухілаў як управа, так і „улева",—вось формы непасрэднай дапамогі кожнага комсамольца Беларусі міжнароднай рэволюцыі. Вось формы перамогі пролетарскай рэволюцыі ва ўсіх краінах.

Дэлегат зьезду сакратар Рэчыцкага РК ЛКСМБ, пяцісотнік т. Бэтнэр

Не забывайцеся,—здарэньні хутка разьвіваюцца. Усе гістарычныя тэрміны скарачаюцца. Процэс „Прамысловай партыі", дзейнасьць групы Кандрацьцева і інш. контррэволюцыйных груп, надыходзячы процэс беларускіх нацыянал-дэмократаў—гэтых агентаў польскіх абшарнікаў і францускіх інтэрвэнтаў,—усё гэта гаворыць за тое, што нам трэба быць да ўсяго гатовымі.

Апошняя рашучая барацьба будзе весьціся на два фронты: з аднаго боку-там за кардонам рабоча-сялянская моладзь будзе несьці, пад кіраўніцтвам КІМ'у, незаплямлены здрадніцтвам соцыял-патрыётаў у час вайны чырвоны сьцяг, сьцяг Лібкнэхта і Леніна, сьцяг рэволюцыйнай барацьбы; з гэтага-ж боку наша пролетарская і сялянская моладзь СССР будзе дапамагаць міжнароднай рэволюцыі. На гэтым фронце асабліва важную ролю грае беларуская працоўная моладзь, бо Беларусь грае ролю фарпосту. Работа ўсяго беларускага комсамолу, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пасьля зьезду павінна зьявіцца ўзорам лепшай гатоўнасьці пайсьці на дапамогу сваім братом, якія церпяць ад прыгнечаньня польскага пана і капіталістычнага панаваньня.

Мы вайны не жадаем, але да абароны нашых заваёў мы павінны рыхтавацца і рыхтуемся. Баявы покліч будзёнаўскага маршу „Ніхто шляху пройдзенага ад нас не адбярэ" азначае комуністычны покліч нашай рабочай моладзі і згуртоўвае ў сябе гэроічную гатоўнасьць грудзьмі мільёнаў абараняць уладу рабочых і сялян.

Няхай жыве комуністычны Інтэрнацыянал! Няхай жыве сусьветная рэволюцыя! (бурныя воплескі).

Дзеньнік зьезду

Вячэрняе паседжаньне

6-га студзеня

Праца зьезду пачынаецца прывітаньнем Н-скай Беларускай дывізіі, пасьля якога з дакладам выступае сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч.

Уважліва слухаюць дэлегаты.

У залі ціша.

Адразу ж, нечакана,—гукі оркестру сьцягі, бляск шабель...

...дзе падшэфная Беларускаму комсамолу—АБКШ.

...— Ударная кузьня камандзіраў трымае порах сухім!

Дэлегаты выкрыкваюць з месц лёзунгі. Усё гэта тоне ў воплесках, энтузіязьме, бадзёрасьці дэлегатаў.

Ля трыбуны дэлегацыя ад рабочых няда на пушчаная гіганцкай штучнай шоўкавай фабрыкі ў Магілеве.

— Вось значок Кім'у, зроблены з штучнага шоўку нашымі комсамольцамі. Гэта наш падарунак зьезду.

Комсамольцы волата па вырабу штучнага шоўку абяцаюць Х зьезду, замест 4, намечаных плянам, кілё шоўку ў дзень выпушчаць 5 кілё.

Дэлегаты заводу „Энэргія" рапартуюць зьезду аб сваёй працы:

— 152 проц. выканан ня прамфінпляну! Арганізаваны вытворчыя комуны, ударныя брыгады!

Шасьць чырвонаармейцаў абкружылі трыбуну,—гэта дэлегацыя броньдывізіёну

— Мы заўжды гатовы даць адпор зарваўшамуся ворагу.

Вайнштэйн адказвае ўсім дэлегацыям.

Зачыняецца вячэрняе паседжаньне.

Ранішняе паседжаньне

7-га студзеня

* Ранішняе паседжаньне 7 студзеня адчыніў т. Пацкоў

Пачаліся спрэчкі па агульна-політычнаму дакладу ЦК КП(б)Б.

Выступаючыя ў спрэчках дэлегаты прыводзілі шмат фактаў героізму комсамолу на фронце барацьбы за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Гомельскі дэлегат тав Каганскі падрабязна застанавіўся на становішчы працы комсамолу на Гомсельмашы.

— Усе сілы комсамолу заводу зараз кінуты на выкананьне прамфінпляну—гаворыць т. Каганскі, і ў выніку мы маем вялізныя посьпехі: з 7-8 машын, што выпускалі раней у дзень, зараз выпускаем 27-28 машын.

* Багаты вопыт сац. спаборніцтва і ўдарніцтва у прамысловасьці ў вельмі малой ступені перанесен у сельскую гаспадарку, гаворыць дэлегат т. Панасьсеў.

У спрэчках выказалася 17 чалавек

* З вялікай увагай дэлегаты слухалі заключную прамову т. Шаранговіча Апошнія словы заключнай прамовы пакрываюцца гучнымі воплескамі ўсёй залі.

* Зьезд пад бурныя воплескі паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦКУсеКП(б), ЦК КП(б)Б і ЦО „Зьвязда".

* Тав. Андрэяў—прадстаўнік комсамолу Заходняга краю вітае зьезд і тут-жа высоўвае прапанову заключыць соцумому з комсамоліяй Савецкай Беларусі па абмену вопыту на працы па жывёлагадоўлі, МТС і ільнаводзтве.

КАМІНТЭРН МОЛАДЗІ—

БАЯВЫ АТРАД РЭВОЛЮЦЫЙНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТУ

БАРАЦЬБА ЗА ПЯЦІГОДКУ ЁСЬЦЬ БАРАЦЬБА ЗА ЗАМАЦАВАНЬНЕ „ДАСЯГНЕНЬНЯЎ КАСТРЫЧНІКА, БАРАЦЬБА ЗА СУСЬВЕТНУЮ ПРОЛЕТАРСКУЮ РЭВОЛЮЦЫЮ

Мацаваць інтэрнацыянальную сувязь, пасіляць інтэрнацыянальнае выхаваньне моладзі, змагацца за большае аўладаньне ёю—баявая задача Ленінскага комсамолу Беларусі

Спрэчкі па дакладу тав. ГОРКІЧА

Раніцаю пасяджаньне зьезду 6-га студзеня было прысьвечана спрэчкам па дакладу тав. Горкіча а выканкому КІМ'а.

Першым у спрэчках выступіў тав. **ВАЎСЯН КЕР** (Гомель), адзначыўшы, што лінія Комуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі сапраўды адпавядала тым задачам, якія выставіў Комуністычны Інтэрнацыянал у пытаньнях развіцьця міжнароднага юнацкага руху. Побач з гэтым тав. **ВАЎСЯН КЕР** адзначыў, што Комінтэрн Моладзі мала ўвагі ўдзяляў правядзеньню практычнай работы. Мы мелі параўнальна у прынцыпах інтэрнацыянальнага выхаваньня моладзі Савецкага Саюзу. Нам неабходна мобілізаваць увагу моладзі, выхоўваючы яе на вопыце барацьбы комсамолу у капіталістычных дзяржавах.

У нас яшчэ надзвычайна дрэнна пастаўлена інтэрнацыянальная сувязь на дапамозе замежнаму комсамолу ў яго барацьбе за сусьветны Кастрычнік.

Далей тав. **ВАЎСЯНІКЕР** спыняецца на пытаньні барацьбы за моладзь.

Некаторыя ячэйкі яшчэ не навучыліся злучаць лёзунг „тварам да вытворчасьці" з задачамі міжнароднага рэволюцыйнага руху.

Перад намі стаіць задача выхаваць моладзь СССР, якая не бачыла капіталістычнага парадку, на фактах гэроічнай барацьбы комсамолу Захаду.

Тав. **ХУДЫШ** у сваім выступленьні адзначыў, што побач са слабай інтэрнацыянальнай сувязьзю, расьце зацікаўленасьць рабочай моладзі да рэволюцыйнага руху, які з кожным днём усё больш разгортваецца ў капіталістычных краінах. Наша моладзь і комсамольская организацыя пасіляваюць сваю актыўнасьць у адказ на тэрорыстычныя акты, якія паяўляюцца супроць нашых комсамольскіх организацый капіталістычных краіў.

Тав. **ВАЙНШТЭЙН** (Полацак) адзначыў, што за ўвесь час было праведзена ў Полацку некалькі інтэрнацыянальных вечароў і больш ніякай інтэрнацыянальна-выхаваўчай працы.

Тав. **АГЕНАЎ** у сваім выступленьні адзначае, што комсамол надзвычайна слабы ўдзел прымае ў працы МОПР'аўскай организацыі. Трэба з усёй сур'ёзнасьцю ўзяцца за гэтую працу, уцягнуўшы ўсіх комсамольцаў і беспартыйную рабочую моладзь у Мопраўскую организацыю.

Тав. **МЭЕР** спыняецца на становішчы з эсперанто. Ён прыводзіць шэраг прыкладаў, калі комсамольцы пачыналі завязваць інтэрнацыянальную сувязь але, не ведаючы мовы, парвалі яе. Далей тав. Мэер спыняецца на сувязі паміж барацьбою за прамфінплян і інтэрнацыянальным выхаваньнем.

— Трэба паказаць кожнаму рабочаму-палетку, кожнай ударніцы, работніцы,—кажа тав. Мэер,— што барацьба за прамфінплян зьяўляецца не толькі барацьбой за выкананьне кантрольных лічбаў нашага будаўніцтва, але што гэта ёсьць барацьба за перамогу сусьветнага пролетарыяту.

Тав. **КАСЬЦЮКОВІЧ** указаў на недатныя бакі ў сыстэме нашай інтэрнацыянальнай працы. Ён прыводзіць шэраг прыкладаў з дадатнага вопыту. Далей ён рапартуе, што Менская комсамольская организацыя ўносіць у фонд зарубежнага комсамолу 1000 рублёў, гэтым яна закладае фундамант у справе далейшага разгортваньня інтэрнацыянальнай работы ў нашых комсамольскіх ячэйках і калектывах.

— Менская комсамольская организацыя,—абвяшчае ён пад воплескі ўсёй залі, уносячы тысячу рублёў у фонд зарубежнага комсамолу, выклікае ўсе комсамольскія организацыі наследваць яе прыкладу.

Гомельскі дэлегат, тав. **КАГАН**, сваю прамову прысьвячае рашэньням апошняга конгрэсу КІМ'у, які адзначыў дрэнную працу некаторых сэкцый Комінтэрну моладзі.



Група дэлегатаў зьезду ў час перапынку.

— Перад апошнім пленумам КІМ'у,—кажа тав. Каган,—была дыскусія па пытаньню аб павароце сэкцыі КІМ'у ў справе заваяваньня рабочай моладзі. На апошнім пленуме стала ясна ў чым павінен выявіцца гэты паварот

Гэты паварот можа быць створаны толькі на падставе жорсткай барацьбы комсамольскіх організацый капіталістычных краін з правым ухілам, які як і ў партыі, зьяўляецца галоўнай небясьпекай, так і асабліва з „левым" сэктанцкім авангардызмам, які зьяўляецца сур'ёзнай небясьпекай у справе заваяваньня большасьці рабочай моладзі.

Далей тав. **КАГАН**, ад імя Гомельскай дэлегацыі, пад бурныя воплескі, рапартуе аб тым, што Гомельская організацыя ўносіць 1500 рубл ў і выклікае Віцебскую організацыю.

Трэба замацаваць—кажа яна,— большую сувязь з нашымі замежнымі комсамольскімі організацыямі.

Тав. **ПАЎЛАЎ** робіць некаторыя заувагі па сутнасьці дакладу. Ён кажа, што дакладчык павінен быў больш спыніцца на пытаньнях узброеньня комсамолу ў барацьбе за генэральную лінію нашай партыі.

— Мы ведаем,—кажа ён,—што ў комуністычных партыях капіталістычных краін правыя элемэнты імкнуліся зьвесьці партыю з правільнага ленінскага шляху. Але комуністычныя партыі, пад правільным кіраўніцтвам Комінтэрну, рашуча ставілі пытаньне аб правых опортуністых, зрабілі адпаведныя высновы і цяпер, на аснове ленінскай програмы, ідуць па шляху ажыцьцяўленьня вялікіх задач. У комуністычных партыях заўважаліся так званыя „левыя" настроі, з якімі ком. партыі вялі самую рашучую барацьбу. Дакладчык амаль нічога не сказаў аб тым, як комсамольскія організацыі садзейнічалі барацьба з правым опортунізмам і „левымі" настроямі, якія заўважаліся ў комуністычных партыях і зусім зразумела, што і ў комсамоле.

Тав. **ГРЫЦЬКО** (Віцебск). Мы жывем у эпоху імпэрыялістычных войн і пролетарскіх рэволюцый. Калі мы сёньня констатуем, што сусьветны экономічны крызіс у наасобных конкретных выпадках перарастае ў палітычны крызіс, калі паасобныя стачкі перарастаюць у палітычную барацьбу, мы павінны паставіць пытаньне: з чым прыйшоў сусьветны комсамол сёньня і наколькі ён гатоў даць у бліжэйшы час адпор сусьветнаму капіталізму.

Далей тав. Грыцько спыняецца на конкрэтных прыкладах барацьбы комсамолу Захаду.

— Калі мы сёньня слухалі лічбы аб тым, што комсамол у параўнаньні з партыйнымі організацыямі налічвае 12 проц., ці не зьяўляецца гэта той практыкай нашага комсамолу, практыкай сэктанцтва, практыкай абмежаванасьці, баязьні ўлізца ў завод з такім разьлікам, каб масы пацягнуць і павесьці за комсамолам. Мы ведаем факты, што калі ў Нямеччыне праходзілі забастоўкі моладзі, комсамол аб гэтай забастоўцы не ведаў. Ці не гаворыць гэта аб тым, што часам паасобныя організацыі комсамолу не працуюць разам з масамі?

Тав. Горкіч указаў, што комсамол, маючы 8000 чалавек у сваіх шэрагах, выходзіць на дэмонстрацыю з 30000, але гэта яшчэ не характарызуе, што ён аўладаў прывадными рамнямі.

Наш лёзунг,—кажа далей тав. Грыцько—„Пяцігодка ў чатыры гады" не ёсьць лёзунг, які абмяжоўвае Савецкі Саюз кітайскай сьцяною. Гэта ёсьць адно з мерапрыемстваў, накіраванае на паскарэньне пролетарскай рэволюцыі ва ўсім сьвеце. Але мы часам гэта робім на-дзяляцку, не растлумачваючы што гэта значыць.

Ад імя Гарадоцкай дэлегацыі,— заяўляе пад воплескі залі тав. Грыцько,—уношу 200 рублёў. Гэта будзе толькі пачатак, бо мы, бязумоўна, будзем працягваць працу на зьбіраньню сродкаў на матэрыяльную дапамогу пад лёзунгам ўмацаваньня інтэрнацыянальнай работы і выклікаем Віцебскі р-н.

Тав. **СУХАЛІЦКІ** (Менск). Мы добра ведаем, якую барацьбу правяла компартыя Польшчы і комсамол у польскім сойме. Я хачу расказаць аб тых мэтадах, якія высоўвае польскі ўрад, каб аўладаць моладзьдзю. Адзін з гэтых мэтодаў —уцягненьня моладзі ў царкву, у касьцёл. У сваёй большасьці моладзь не зьяўляецца рэлігійнай, і дзеля таго, каб уцягнуць яе ў цэркаў, надзвычайна часта ў Польшчы практыкуюцца апавяшчэньні аб тым, што ў царкве адбудзецца концэрт і г. д. Моладзь ідзе паслухаць концэрт, а яе частуюць дакладам у антысавецкім духу.

У заключэньне тав. Сухаліцкі адзначае, што пры ЦК комсамолу неабходна стварыць асобны сэктар па інтэрнацыянальнаму выхаваньню моладзі.

Тав. **ЯКУБОВІЧ** адзначае, што дакладчык указаў на тое як рабочая моладзь вядзе барацьбу ва ўмовах узрастаючага экономічнага крызісу, узрастаючай актыўнасьці моладзі капіталістычных краін, але ён не адзначыў, як яна зараз вядзе работу ў адносінах сялянскай моладзі, як яна ва ўмовах гэтага крызісу вядзе сваю барацьбу з капіталізмам.

Трэба адзначыць, што комсамол Беларусі,—кажа ён,—цікавіцца пытаньнямі інтэрнацыянальнага выхаваньня, але цікавіцца недастаткова, і таму X зьезд комсамолу Беларусі, напярэдадні адчыненьня IX-га Усесаюзнага зьезду комсамолу, павінен даць старт фінішу правядзеньня інтэрнацыянальнага пытаньня ўнутры комсамольскай організацыі. Я лічу, што гэты старт X-ы зьезд камсамолу Беларусі павінен прыняць, выпрацаваўшы конкрэтныя мерапрыемствы па яго правядзеньню, што будзе азначаць пэўны паварот комсамолу Беларусі да вырашэньня гэтых задач.

Тав. **ВОЛЬФСОН** (Віцебск). У час перапынку Віцебская дэлегацыя сабралася і абмеркавала выклік Гомельскай організацыі ўнесьці 1500 рублёў на фундамант лепшага наладжаньня інтэрнацыянальнай работы. Наша дэлегацыя, абмеркаваўшы гэтае пытаньне, уносіць 2000 рублёў у знак фундаманту нашай работы па ўзмацненьню інтэрнацыянальнай сувязі і выклікае менскую гарадзкую організацыю. (Доўгія, нястрыманыя воплескі). Акрамя таго, наша дэлегацыя дадаткова выклікае Гомельскую організацыю, каб яна ўнесла яшчэ 500 рублёў. Мы абмеркавалі пытаньне аб перанясеньні лепшага вопыту работы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню і бярэм на сябе абавязак па сканчэньню зьезду перанесьці гэты вопыт ва ўсе зьвеньні нашай організацыі,—пад бурныя воплескі канчае т. Вольфсон.

Тав. **РУТЭНБЕРГ** адзначае, што сама пастаноўка дакладу КІМ'у на X-м зьезьдзе комсамолу Беларусі павінна зьявіцца важнейшым штуршком у справе ўзмацненьня інтэрнацыянальнага выхаваньня комсамольскай організацыі.

Таварышы Гуцаюк, Агеяў, Гапенаў (Рэчыца), Шамко, Магілянскі, Грабенка, Гаркінаў, Пятленка (на ўкраінскай мове) і інш., у сваіх прамовах адзначылі слабасьць інтэрнацыянальнай працы нашага комсамолу, кампанейскі характар гэтай працы. Яны адзначылі, што сувязь з замежным комсамолам настаўлена яшчэ зусім слаба, і што зьезд павінен будзе па гэтаму пытаньню сказаць сваё слова, Таксама ў спрэчках адзначана, што наш друк удзяляе надзвычайна мала ўвагі пытаньням барацьбы з межнага комсамолу, слаба мобілізуе вакол гэтай барацьбы ўвагу нашай комсамольскай організацыі

Забясьпечыць актыўны ўдзел комсамольскіх організацый у дапамозе саветам ФК па правядзеньню лыжнай эстафэты

Пастанова сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 1-га студзеня 1931 году

Ухваліць мерапрыемствы Вышэйшага Савету Фізычнае Культуры Беларусі па організацыі ў гонар X-га зьезду саветаў БССР Усебеларускай лыжнай эстафэты „Працоўных дасягненьняў і гатоўнасьці да абароназдольнасьці краіны".

Надаючы вялікае значэньне організуемай эстафэце, якая ставіць перад сабою мэту: збор і дастаўку X-му зьезду саветаў рапартоў фабрык, заводаў, колгасаў, саўгасаў, сельсаветаў, выканаўчых камітэтаў і інш. грамадзкіх організацый аб выніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, выкананьне асобнага кварталу 3-га, рашаючага году пяцігодкі, удзел у гэтых мерапрыемствах фізкультурнікаў Беларусі і іх гатоўнасьці да абароны краіны саветаў,—Бюро ЦК ЛКСМБ абавязвае ўсе грамадзкія і раённыя камітэты комсамолу забясьпечыць актыўны ўдзел і дапамогу мясцовым саветам ФК у організацыі і правядзеньні гэтай эстафэты.

Вакол правядзеньня Ўсебеларускай лыжнай эстафэты стварыць шырокую грамадзкую думку сярод комсамольцаў і б-п рабочай, колгаснай, бядняцка-батрацкай і серадняцкай моладзі праз друк, сходы, нарады і г. д., мобілізоўваючы іх гэтым самым на актыўны ўдзел у эстафэце, разьвіцьці і перабудове ФК руху ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і кіруючых органаў Саюзу.

Камітэтам і ячэйкам ЛКСМБ зьвярнуць асаблівую ўвагу на своечасовае правядзеньне падрыхтоўчай работы да Ўсебеларускай лыжнай эстафэты, забясьпечыўшы актыўны ўдзел прадстаўнікоў ЛКСМБ у працы оргкамітэтаў пры мясцовых саветах ФК і ў адборы ўдзельнікаў эстафэты з лепшых політычна падрыхтаваных комсамольцаў і працоўнай моладзі.

Улічваючы, што на ўдзельнікаў лыжнай эстафэты ўскладаецца вялікія адказнасьць па правядзеньню грамадзка-політычнай работы ў дарозе зьвярнуць асаблівую увагу на глыбокую прапрацоўку яе ўдзельнікамі ўсіх пытаньняў, пад лёзунгам якіх праходзіць эстафэта (праз інструктаваньне, забясьпечаньне іх патрэбнай літаратурай і г. д.).

У склад Оргкамітэту пры ВСФКБ па правядзеньню Ўсебеларускай лыжнай эстафэты прадстаўніком ЦК ЛКСМБ выдзеліць тав. Гузікава.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР— **РЭДКОЛЕГІЯ**

Друкарня імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 599